ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
14.09.2021 г. № 157

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе (далей – конкурс).

2. Мэтай конкурсу з'яўляецца вызначэнне куратарскай канцэпцыі нацыянальнага павільёну, а таксама выяўленне неабходных арганізацыйных мерапрыемстваў па арганізацыі і правядзенні выстаўкі для прадстаўлення на высокім ідэйна-мастацкім узроўні беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе (далей – Канцэпцыя), якая пройдзе ў г.Венецыя (Італія) і ўдзел у якой плануе прыняць Рэспубліка Беларусь.

3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства) і дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу "Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь" (далей – Цэнтр).

4. Прыём заявак будзе праводзіцца з 13 верасня па 24 верасня 2021 года.

5. Удзельнікамі конкурсу могуць быць мастацтвазнаўцы, мастакі і іншыя фізічныя асобы, якія маюць вопыт арганізацыі і правядзення буйных культурных праектаў у галіне выставачнай дзейнасці (далей – удзельнікі конкурсу).

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

6. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца на афіцыйных сайтах Міністэрства і Цэнтра, змяшчае звесткі аб конкурсе, яго ўмовах, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых удзельнікамі конкурсу

матэрыялаў, парадку і тэрміне аб’яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

7. Для прыняцця ўдзелу ў конкурсе неабходна да 24 верасня 2021 года ўключна падаць заяўку па форме згодна з дадаткам да сапраўднай Інструкцыі па адрасе: г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11, каб.718, кантактны тэлефон + 375 17 204 86 05.

Канцэпцыя і канверт ўдзельніка конкурсу павінны быць прадстаўлены ўдзельнікамі конкурсу да 18 кастрычніка 2021 года не пазней 17.00 па адрасе: 220040, г.Мінск, вул.Някрасава, 3, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу “Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь”.

Канцэпцыі прадстаўленыя на конкурс пазней названых часу і даце да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца. Дата прадстаўлення матэрыялаў, якія дасылаюцца па пошце, вызначаецца па паштовым штэмпелі адпраўшчыка.

8. Канцэпцыя павінна ўлічваць:

дэвіз і тэму 59-ай Венецыянскай біенале – “The Milk of Dreams” (“Малочныя мары”)*;

адлюстраванне новых арыгінальных ідэй сучаснага мастацтва ў Беларусі, а таксама распаўсюджванне інфармацыі аб сучасным беларускім мастацтве за мяжой;

прадстаўленне беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале – на высокім ідэйна-мастацкім узроўні;

абгрунтаванне кошту рэалізацыі канцэпцыі.

Аўтар канцэпцыі гарантуе, што пры рэалізацыі свайго праекта будуць выкананыя нормы заканадаўства Рэспублікі Беларусь і міжнародных дагавораў аб аўтарскім праве і сумежных правах;

тэрмін правядзення 59-ай Венецыянскай біенале – з 22 красавіка па 27 лістапада 2022 года.

Канцэпцыя прадстаўляецца на беларускай або рускай мове ў двух друкаваных экзэмплярах ў запячатаным канверце, дадаткова падаецца версія на электронным носьбіце.

9. У мэтах захавання ананімнасці ўдзельнікаў конкурсу Канцэпцыя прадстаўляецца пад чатырохзначным нумарам, які ўказваецца самастойна ўдзельнікамі конкурсу ў левым верхнім вугле Канцэпцыі, а таксама на канверце ўдзельнікаў конкурсу.

Канверт удзельніка конкурсу ўяўляе сабой асобны запячатаны канверт, у які ўкладваецца інфармацыйны ліст са звесткамі пра ўдзельніка конкурсу: прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца), год нараджэння, адукацыя, месца працы, хатні адрас, кантактны тэлефон, адрас электроннай пошты,

---

*Дадатковыя звесткі — на сайце біенале www.labiennale.org

вопыт арганізацыі і правядзення буйных культурных праектаў у галіне выставачнай дзейнасці.

10. Прадстаўленне заяўкі, канцэпцыі і канверта ўдзельніка конкурсу азначае яго згоду ў выніку перамогі стаць куратарам беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале.

11. Канцэпцыі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца ўдзельнікам конкурсу.

12. Для разгляду Канцэпцый ствараецца журы конкурсу, склад якога зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

13. Канцэпцыі разглядаюцца журы конкурсу на закрытым пасяджэнні не пазней 21 кастрычніка 2021 года.

14. Рашэнне прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу журы конкурсу адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў "за" і "супраць" голас старшыні журы з'яўляецца вырашальным.

Рашэнне журы конкурсу афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі журы конкурсу, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

15. Члены журы могуць рабіць заўвагі і ўносіць свае прапановы да выбраных Канцэпцый.

Праект пераможцы конкурсу павінен быць рэалізаваны з улікам заўваг і прапаноў журы конкурсу.

16. Крытэрыі ацэнкі Канцэпцый:

адпаведнасць умовам конкурсу;

наяўнасць новых арыгінальных ідэй;

выкарыстанне сучасных арт-практык у працэсе арганізацыі выставы;

кошт стварэння праекта.

17. Пасля вынясення рашэння журы па выніках конкурсу, канверты ўдзельнікаў конкурсу распячатваюцца і ў адпаведнасці з прынятым рашэннем журы абвяшчаецца пераможца конкурсу.

18. Вынікі конкурсу публікуюцца на афіцыйных сайтах Міністэрства і Цэнтра не пазней 28 кастрычніка 2021 года (пасля вынясення рашэння журы).

19. Пераможца конкурсу атрымлівае права стаць куратарам беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале пры ўмове заключэння адпаведнага дагавора з Цэнтрам да 30 лістапада 2021 года.

У выпадку, калі журы конкурсу не вызначыць пераможцу конкурсу, Міністэрства мае права паўторна правесці конкурс ці адмовіцца ад удзелу ў 59-ай Венецыянскай біенале.

20. Паштовыя і іншыя выдаткі ўдзельнікаў конкурсу аплачваюцца за іх кошт.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзенні паўторнага конкурсу на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе

Форма

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

____________________________________
Прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое ёсць) аўтара або кіраўніка аўтарскага калектыву

____________________________________
тэлефон

ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў конкурсу на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе.

Паведамляю, што з'яўляюся аўтарам куратарскай канцэпцыі, якая прадстаўлена мной для разгляду на конкурсе.

У выпадку перамогі ў конкурсе на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 59-ай Венецыянскай біенале сучаснага мастацтва ў 2022 годзе абавязваюся пры неабходнасці дапрацаваць канцэпцыю з улікам заўваг журы конкурса.

Абавязуюся прадставіць конкурсныя матэрыялы да 18 кастрычніка 2021 года не пазней 17.00 па адрасе: 220040, г.Мінск, вул.Някрасава, 3, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу "Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў".

З умовамі конкурсу азнаёмлены і згодны.

| ____________________ | ____________________ | ________________ |
|---|---|---|
| ініцыялы, прозвішча, аўтара або кіраўніка аўтарскага калектыву | подпіс | дата |